Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 8 Вільня, Пятніца 27 Лютага 1931 г. Год VII (XV)

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

Беларуская

# КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

**Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі:**
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

# ПРАТЭСТ

## Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні ў справе прасьледу камуністычнай уладай Беларускага народу ў Усходн. Беларусі.

Агульны сход Беларускага Нац. Камітэту ў Вільні, дня 22-га лютага 1931 г. усебакова разгледзіўшы і абгаварыўшы палажэньне тае часьці Беларускага народу, якая знаходзіцца пад уладай камуністычнай партыі ў Усходняй Беларусі, сьцьвярджае:

**Што народна-культурнае палажэньне Беларускага народу ўва Усходн. Беларусі пад уладай камуністычнай партыі зрабілася вельмі цяжкім, проста трагічным. Акупацыйная камуністычная ўлада, таксама як даўней царская, маючы на сваіх услугах дзяржаўны апарат, а так-жа беларускіх рэнэгатаў, імкнецца да поўнага зьніштажэньня народнай і культурнай самабытнасьці Беларускага народу.**

Аб гэтым сьведчаць факты:

Камуністычная ўлада, як гэта сяньня ведама ўсяму сьвету, сілай руйнуе адвечны гаспадарчы і грамадзкі строй у Усходняй Беларусі, пад нячуваным прымусам заганяючы беларускае сялянства ў калектывы і камуны і заводзячы чужы для Беларускага народу гаспадарчы лад, які ёсьць паваротам да часоў нявольніцтва і паншчыны, калі сілаю заганялі да працы на сваіх паноў.

Камуністычная ўлада ў сувязі з колектывізацыяй праводзіць дэнацыяналізацыю Усх. Беларусі, сілаю высяляючы цэлыя масы Беларускага народу ў Сібір і іншыя далёкія краіны Расеі, а на іх месца прысылаючы насельніцтва з чужых краёў і народаў.

Камуністычная ўлада, разам з матэр'яльным і фізычным руйнаваньнем Беларускага народу, руйнуе таксама і душу ягоную, праводзячы страшэнны прасьлед рэлігіі, закрываючы сьвятыні і зносячы праявы рэлігійнага жыцьця ў Усходн. Беларусі.

Камуністычная ўлада праводзіць пляновую і сыстэматычную дэмаралізацыю пасярод беларускай моладзі, адбіраючы ад яе ідэалізм, яе духовае і нават фізычнае здароўе і руйнуючы гэтым будучыню Беларускага народу.

Проціў гэтых фактаў зьдзеку над Беларускім народам Беларускі Нац. Камітэт ужо няраз падымаў свой голас пратэсту і цяпер пратэстуе.

Але ў апошнім часе здарыліся факты, якія сьведчаць аб тым, што камуністычныя ўлады прыступілі да поўнага здушэньня беларускае культуры і народнага жыцьця беларускага ў Усходн. Беларусі. **Найлепшыя беларускія культурныя сілы, сябры Беларускай Акадэміі Навук, прафэсары вышэйшых школаў, беларускія вучоныя, паэты і пісьменнікі арыштаваны і пасаджаны ў вастрог, дзе паддаюць іх страшэнным моральным і фізычным мучэньням.** У ліку арыштаваных знаходзяцца такія выдатныя і заслужаныя перад Беларускім народам асобы, як рэктар Менскага ўнівэрсытэту праф. Пічэта, ведамы вучоны і сэкрэтар Беларускай Акадэміі Навук Ластоўскі; акадэмікі: Некрашэвіч, Лёсік, Смоліч; прафэсары і вучоныя: Гарэцкі, Прышчэпаў, Адамовіч, Баліцкі, Краскоўскі, Цьвікевіч, Савіцкі, Багдановіч; паэты і пісьменні: Аляхновіч, Дудар, Зарэцкі, Пушча, Лужанін і шмат, шмат іншых, якія становяць цьвет беларускай навукі і літэратуры. Ужо ад некалькіх месяцаў сядзяць яны ў вастрозе, у нячувана цяжкіх варунках, а камуністычная ўлада гатовіць вялікі працэс, дамагаючыся ўжо цяпер для іх кары сьмерці.

Гэтакі прасьлед працаўнікоў на ніве бел. культуры мае месца ня толькі ў Менску, сталіцы Р. лавай Беларусі, але і ў Віцебску, Полацку, Смаленску, Магілёве, Гомелі і па іншых гарадох Усходн. Беларусі.

Найстарэйшага з сучасных бел. культурных работнікаў, прафэсара Менскага ўнівэрсытэту Эпімаха-Шыпіллу, Нэстара бел. культурнага адраджэньня, камуністычная ўлада пасадзіла ў турму, а потым з Беларусі выслала ў далёкі Петраград, дзе кінула бяз ніякіх спосабаў да жыцьця і гэтым асудзіла ў камуністычных варунках на павольную сьмерць.

Палітыка камуністычнай улады, руйнуючая Беларускі народ і яго культуру, стане яшчэ выразьнейшай, калі сабе прыпомнім, што гэтая самая ўлада, некалькі гадоў таму, заклікала з іншых краёў у граніцы Усходн. Беларусі некаторых беларускіх культурных работнікаў (Гарэцкага, Смоліча, Ластоўскага, Цьвікевіча, Краскоўскага, Савіцкага, Багдановіча, Аляхновіча) з тым, каб потым іх пасадзіць у вастрог і цяпер дамагацца для іх кары сьмерці.

Гэтыя арышты, зьдзекі над арыштаванымі, а так-жа і дамаганьні для іх сьмерці прывялі апошнім часам да такіх трагічных выпадкаў, як самагубства б. прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук праф. Ігнатоўскага, а так-жа найвялікшага з паэтаў Беларускага народу Янкі Купалы. Камуністычная ўлада прымушала іх жадаць сьмерці для ўвязьненых беларускіх культурных работнікаў, іх таварышоў, з каторымі яны супрацоўнічалі на культурнай ніве. **Ня могучы перанесьці моральнага зьдзеку з боку акупацыйнай камуністычнай улады, яны скончылі сваё цяжкое жыцьцё самагубствам, каб крывёй сваёй запратэставаць проціў душэньня Беларускага народу і яго культуры.**

Сьцьвярджаючы гэтыя факты Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні перад усім культурным сьветам **пратэстуе:**

**Проціў страшэннага і дзікога прасьледу беларускіх культурных работнікаў у Усх. Беларусі, якіх камуністычная ўлада арыштоўвае, мучыць у турмах і для якіх дамагаецца кары сьмерці;**

**Проціў моральнага зьдзеку над тымі беларусамі, якія яшчэ асталіся на свабодзе і якіх камуністычная ўлада, прымушаючы жадаць кары сьмерці для сваіх таварышоў, пасаджаных у турмы, застаўляе канчаць жыцьцё сваё самагубствам, як гэта сталася з праф. Ігнатоўскім і Янкам Купалай;**

**Проціў усіх праяваў гнібеньня беларускай культуры і гэтым самым ніштажэньня душы Беларускага народу;**

**Проціў усіх праяваў матэр'яльнага, фізычнага і духовага ніштажэньня Беларускага народу пад уладай Саветаў.**

Гэты пратэст Беларускі Нац. Камітэт пастанаўляе падаць да ведама Беларускага народу, усяго культурнага сьвету, а так-жа пераслаць Савецкаму пасольству ў Варшаве.

**БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМІТЭТ**

## Гаспадарчы самаўрад.

Гаварылі мы нядаўна („Бел. Крыніца" № 3-31 г.) аб г. зв. самаўрадах тэрытарыяльных. Сягоньня затрымаймося над самаўрадам гаспадарчым, іменна—землябробскім.

З грамадзка-землябробскіх дабраволных арганізацыяў на заходня-беларускіх землях за апошнія гады найбольш нарабілі шуму арганізацыі польскія: „Kółko Rolnicze" і „Towarzystwo Rolnicze". Першае („K. R.") гуртавала пераважна дробных гаспадароў, а „T-wo Roln." — большых і меншых абшарнікаў. Як адны так і другія былі дзяцьмі аднэй маткі і супольна ссалі адну і тую-ж кароўку — казну — аж да 1929 г., калі вышаў міністэрскі загад аб варунках і парадку атрыманьня грашовых запамогаў прыватна-праўнымі фаховымі арганізацыямі. Гэты загад змусіў дагэтуль самастойныя земл. арганізацыі злучыцца ў адну, бо йнакш аніводная з іх грашовай дапамогі больш не дастала-б... І злучыліся, быццам пабраліся, у „Centr. T-wo Kółek i Organ. Rolniczych", прычым кожны прынёс у новую сям'ю свой „радзімы" пасаг: „Kółko Rolnicze"—людзей, „T-wo Rolnicze" — грошы, а асаднікі, меўшыя дагэтуль сваю таксама асобную арганізацыю,— мазгі, кіруючыя фактычна дагэтуль усім жыцьцём новай арганізацыі на нашых землях.

Запамогі вярнуліся ўзноў, пачалося жыцьцё. Але не такое „сонечнае". Пачаліся падкопы, у рэзультаце каторых заплечнікі „беспартыйных" пачалі „выкурываць" з арганізацыі нявыгодных сабе людзей. І выкурылі... шмат. А калі самым стала за... вольна, мусілі шукаць людзей новых. Пайшлі ў саюз землябробскай коопэрацыі („Zjednoczenie Związków Spółdzielni Rolniczych"), з каторым, праўда, пакуль што не „пабраліся", але ўсё-ж „заручыліся": на пачатку сёл. году падпісалі ўмову аб супрацоўніцтве.

Гэтак стаіць справа з прыватна-праўнымі землябробскімі арганізацыямі. Існуючым правам (68 арт. польскай канстытуцыі з 17.III.21 г.) прадубачацца аднак і іншыя, г. зв. публічна-праўныя землябробскія арганізацыі, да каторых кожны землябор, хоча ці ня хоча, а належыць мусіць. Гэта форма прымусовай арганізацыі і ёсьць уласьцівым гаспадарча-землябробскім самаўрадам. Распараджэньне Прэзыдэнта Р. П. з дн. 22.III 28 г. паз. 385 азначае гэту будучую арганізацыю, — дагэтуль сарганізавалася яна нанова толькі ў Варшаве, — як „Землябробскую Палату" („Izba Rolnicza"). Абшар кожнай Землябробскай Палаты мае пакрывацца — але не заўсёды — з абшарам ваяводзтва, кожны землябор да яе будзе мусіць належыць і плаціць на яе падаткі. Гэта — абавязкі.

А правы?.. Сяброў Рады Землябробскіх Палатаў будуць выбіраць: 1. павятовыя Соймікі, 2. гарадзкія Рады, 3. грамадзка-землябробскія (дабраводьныя) арганізацыі; 4. будуць там урэшце засядаць і людзі проста назначаныя Ўрадам. Выбраным можа быць толькі ўласьнік, або кіраўнік землябробскай гаспадаркі, або асоба маючая найменш сярэднюю фахова-землябробскую адукацыю. Кожная Землябробская Палата меціме ўласны статут. Урадовай мовай Земл. Палаты мае быць мова польская.

Да поўнага зразуменьня фактычнага і праўнага стану беларускага землябробства пад Польшчай трэба дадаць, што асобных беларускіх фахова-землябробскіх арганізацыяў мы тут ня маем, а палажэньне Беларусаў у існуючых у нас землябробскіх польскіх арганізацыях у найлепшым разе можа быць параўнана з палажэньнем кутніка: сядзі спакойна і слухай; ты тут не гаспадар! Калі-б

дзе на першы лепшы сход ці зьезд гэтых арганізацыяў, а сам найлепш пракаваецца, што ўсім там кіруюць розныя панкі, шляхтункі, а перадусім — асаднікі. Наш-жа беларускі мужычок сядзіць там ціха ў куце і не разявіцца.

Гэта не дэмагогія, а праўда, якая паказуе, як далёкай і чужой для нашага сялянства ёсьць польская па форме і па зьместу арганізацыя земляробства. З другога боку і лепшай, с в а е й фаховай арганізацыі пакульшто няма, а калі-б і была, дык сяньня, калі побач і адначасна існуюць такія-ж арганізацыі польскія, шчодра абдараваныя як грашмі з падаткаў, плачаных усім сялянствам — і беларускім, — так і ўсестароннай урадавай апекай — свая беларуская арганізацыя, ня толькі пазбаўленая ўсякай дапамогі, але і выстаўленая на ўсякую няласку „маючых сілу“, шмат не даказала-б.

З усяго гэтага вывад, што „да пары — да часу“, каб сяк-так пражыць, покуль лепшага нічога няма і каб хоць часткова карыстаць з падаткаў плачаных на запамогі для земляробскіх арганізацыяў, ня варта ад гэтых істнуючых ужо арганізацыяў уцякаць. Карысьць будзе залежыць ад таго, хто акажыцца выбраным да кіраваньня земляробскай арганізацыяй: трэба туды пасылаць людзей талковых і сваіх, а ніколі — рожных панскіх падлізаў. Значэньне і лёс гэтых арганізацыяў залежа б е с п а с я р э д н а ад волі ейных сяброў, паасобных гаспадароў.

Што датыча ўласьцівага земляробскага самаўраду, Земляробскіх Палатаў, дык тут наша земляробства мае ўплыў прадусім п а с я р э д н ы: выбіраючы і пасылаючы туды прадстаўнікоў ад сваіх фахова-земляробскіх арганізацыяў, а яшчэ больш — праз сваіх прадстаўнікоў у павятовых Соймiках, якія (распараджэньне Прэзыдэнта Р. П. з 22.III.28 г., паз. 385) выбіраюць сяброў Земл. Палаты ня толькі з пасярод сяброў Сойміку, але наагул грамадзян краю, адпавядаючых заняцьцем сваім, або алукацыяй, варункам прыведзеным вышэй. Відаць з гэтага, як важным ёсьць браць чыннае ўчасьце ў жыцьці як земляробскіх арганізацыяў, так і тэрыторыяльнага павятовага самаўраду (Соймікаў), складаючагася ў нас сяньня з прадстаўнікоў самаўраду гміннага, па двух людзей з кожнага.

Агульным для ўсіх Беларусаў павінна быць правіла, што дабрабыт сам ніскуль і ніколі да нас ня прыйдзе, ніхто яго нам не падаруе: яго трэба з д а б ы в а ц ь! Для нашых-жа грамадзка-палітычных установ найважнейшай у гэтым кірунку справай ёсьць дамагчыся прадстаўніцтва ў Земляробскіх Палатах для беларускіх грамадзка-гаспадарчых арганізацыяў і каб статуты для земляробскіх самаўрадаў на беларускіх землях забясьпечывалі грамадзкія правы здабыткам беларускай культуры, а прадусім — вольнаму б е л а р у с к а м у слову.

## З Беларускага жыцьця.

**Агульны сход Беларускага Нацыянальнага К-ту,** які адбыўся 22 г. м., прыняў пратэст процiў душэньня беларускага народнага руху і нішчэньня беларускай народнай культуры ў Усходняй Беларусі.

**Адміністрацыйная ўлада не дала дазволу на беларускае прадстаўленьне.** На дзень 8 лютага с. г. Будслаўскі гурток Бел. Інст. Гасп. і Культуры меў намер наладзіць беларускае прадстаўленьне ў в. Палесі каля Будслава. Але Вялейскі стараста на гэнае прадстаўленьне ня даў дазволу.

**Беларуская санацыя зьбіраецца пратэставаць процiў камуністычнага тэрору.** З прычыны апошніх падзеяў у Усх. Беларусі Урад Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні 20 г. м. склікаў на нараду ўсе беларускія арганізацыі. Зьявіліся: Антон Луцкевіч, „Дзядзька“ Т. Вярнікоўскі, Янка Станкевіч, дыр. Астроўскі, Ф. Акінчыц і інш., каб запратэставаць процiў камуністычнага тэрору ў Усх. Беларусі. Гэты сход, пад старшынствам студ. Ст. Станкевіча, выбраў камісію і даручыў ёй наладзіць пратэст.

Выяўляецца цікавая роля Ўраду Бел. Студ. Саюзу, які йграючы ў нейкае „пасярэдніцтва“ прытуліўся да санацыйнага плоту. Што-ж на гэта Студ. Саюз.?

**Канфіската.** Па загаду Віл. Гарадзкога Старасты 24 г. м. сканфіскавана прамова пасла Ф. Ярэміча.

**Новы гурток Беларускага Інст. Гасп. і Культуры** паўстаў у Мур.-Ашмянцы, Ашмянскага пав.

**Санацыйныя бліны пры закрытых дзьвярах і тарапаты Ураду Бел. Студ. Саюзу.** У суботу 21 г. м. беларуская санацыя пад плашчам Ураду Б. С. С. ладзіла „вільготныя“ запусныя бліны. На гэтыя бліны санатары запрашалі гасьцей ад сябе, а Урад Б. С. С. ад сябе. Калі-ж зышліся гасьці, арганізатары бліноў пачалі „перасяваць“ гасьцей, дапытываючы, хто іх запрасіў. На гэтыя бліны былі так-жа запрошаны непасьвячанымі ў „тайніцы“ санацыі—бел. студэнтамі некаторыя студэнты ўкраінцы. Калі-ж гэта ўбачылі „главары“ санацыі і калі самі ўкраінцы зразумелі, куды трапілі, прышлося ім пакінуць „санацыйную кватэру.“

Сьмешныя гэта штукі і каб яны мелі чыста прыватны характар беларускай санацыі, дык шкада было-б мейсца і часу аб іх пісаць. Але ўважаючы гэта за сьведамы крок санацыйных пляна ў у кірунку разбіцьця адзінага фронту і беларускага студэнства і саюзу студэнства беларускага, украінскага і літоўскага, мы змушаны аб гэтым пісаць з мэтаю перасьцярогі студэнства перад непатрэбнымі канфліктамі.

### З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

**Далейшы паход у кірунку нішчэньня беларускасьці і дамаганьне суровай кары для беларускіх вучоных.** „Савецкая Беларусь“ з дня 20.II. с. г. зьмяшчае справаздачу пастаноў III усебеларускага вучыцельскага зьезду 19 г. м., у якім між іншым сказана:

— „Зьезд патрабуе ад ураду Б.С.С.Р. самага жорсткага, бязьлітаснага пакараньня контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў.“

**Адказ Б. Тарашкевіча на адкрытае пісьмо А. Луцкевіча, Астроўскага, Акінчыца і кумпаніі.** „Сав. Беларусь“ з дня 20.II. с. г. зьмяшчае адкрытае пісьмо ад імя ўсіх быўшых грамадаўскіх паслоў за подпісам Б. Тарашкевіча ў адказ на адкрытае пісьмо Луцкевіча, Астроўскага, Акінчыца і кумпаніі, зьмешчанае ў „Народным Звоне“ № 6 1930 г. У гэтым „адкрытым“ пісьме Б. Тарашкевіча пацьвярджаецца, што адозвы падпісаныя „старшынёй Грамады“ Б. Тарашкевічам, у якіх ужыты вось такія словы:

„Банда Луцкевічаў, Астроўскіх, Акінчыцаў, Крукоў, Каралёў, Міцкевічаў“, „Патрыярхі беларускае здрады“, „правакатары і найзаядлейшыя пракуроры Грамады“, „пагромшчыкі ўсіх беларускіх культ.-прасьветных арганізацыяў“, „платныя шпікі польскае дэфэнзывы“, „разбойвікі, арганізуючыя напады на Беларускі Сял.-Раб. Клюб „Змаганьне,“ „грабары сацыяльна-нацыянальнага вызвольнага руху працоўных Зах. Беларусі,“ „беларускія Азэфы,“ „правакатары і пагромшчыкі,“ „обэр-сышчыкі“ і г. д. — выданы за ведама Б. Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага і Мятлы. Адначасна з прызнаньнем аўтарства ўспомненых адозваў, зьмест „адкрытага“ пісьма Тарашкевіча праводзіць мяжу між Тарашкевічам, Рак-Міхайлоўскім з таварышамі з аднаго боку, Луцкевічам, Астроўскім з кумпаніяй— з другога боку. Адкрытае пісьмо заяўляе, што Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі і таварышы ідуць рука аб руку з камуністамі, а Луцкевіч, Астроўскі і кумпанія ідуць у саюзе з польскімі капіталістамі і абшарнікамі.

Пры гэтым трэба адзначыць, што гэткая тактыка з боку камуністаў у адносінах да Тарашкевіча—падобная на правакацыю, бо адкрытае пісьмо Тарашкевіча камуністычная газэта апублікавана толькі пасьля арышту апошняга. Цікава, што на гэта адкажуць быўшыя грамадаўцы, а цяпер палёнофілы: Луцкевіч з кумпаніяй?

## Абразок з жыцьця нашых эмігрантаў у Бразыліі.

Цяжкі лёс беларусаў на бацькаўшчыне змушае іх часта эміграваць у далёкія краіны за мора ў пагоні за каваклам хлеба. На чужыне нашы эмігранты часта спатыкаюцца яшчэ з большым горам, чым на сваей роднай вузенькай баразьне на бацькаўшчыне.

Наша рэдакцыя атрымала гэтымі днямі пісьмо ад эмігрантаў беларусаў, выехаўшых у Бразылію, шукаючы заработкаў, каб паправіць лёс свой і сям'і ў краю.

## У дзесятыя ўгодкі сьмерці Андрэя Зязюлі.

17.I. сёлетняга году мінула дзесяць гадоў ад сьмерці беларускага паэта кс. Аляксандра Астрамовіча — Андрэя Зязюлі. Восьжа з гэтай прычыны і пасьвячаем тут колькі думак яго сьветлай памяці і творчасьці.

Аляксандра Астрамовіч радзіўся 26.XI 1878 г. у сялянскай беларускай каталіцкай сям'і ў сяле Навасяды, Гальшанскай гміны, Ашмянскага пав. Вучыўся ён у Ашмянскай павятовай школе, скончыўшы якую паступіў у 1905 г. у каталіцкую духоўную сэмінарыю ў Пецярбурзе. Сэмінарыю скончыў 1910 г. і быў пасьвячаны на ксяндза.

Як ксёндз, працаваў А. Астрамовіч у Ракаве, Валожынскага пав., у Ганнаполі пад Менскам, у Сьмілавічах, Ігуменскага пав., у Рубяжэвічах, Стаўпецкага пав., і ў Сенно, Магілёўскай губ., дзе памёр і пахаваны 18.I. 1921 году.

Пачаткавае беларускае адраджэньне, якога зярняткі пасьля Фр. Багушэвіча сеяў у першых гадох XX ст. праф. Эпімах-Шыпілла, захапіла такжа і Астрамовіча.

У сэмінарыю ён прышоў сьведамым беларусам. Ужо на школьнай лаве пачаў ён пісаць свае вершы пад мянюшкай Андрэй Зязюля.

Вершы свае друкаваў А. Зязюля ў часопісях: „Наша Ніва“, „Беларус“, „Сьветач“, „Вольная Беларусь“, „Крыніца“, а так-жа ў асобных кніжыцах: „З роднага загону“. „Слова праўды“ і „Аленчына вясельле“. Апрача гэтага, многа вершаў Зязюлі знаходзяцца ў рукапісах нігдзе дагэтуль недрукаваных. І так пасьля яго сьмерці многа яго вершаў аказалася ў праф. Шыпіллы, часьць у Купалы і найменшая часьць у цяперашняга рэктара Місыйнага Усходняга Інстытуту ў Любліне, кс. Л. Хвецькі, які, на жаль, выяжджаючы з Пецярбурга пакінуў іх у свайго знаёмага.

Творы А. Зязюлі друкаваныя ўжо, як даведваемся, Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры зьбірае ў вадзу цэласьць і прыбіраецца выдаць асобнай кніжыцай яшчэ сёлета з прычыны дзесятых угодкаў сьмерці паэта, а ці будзе суджана ўбачыць калі сьвет гэным вершам, што ў рукапісах пааставаліся на руках розных людзей, — згадаць трудна

Андрэй Зязюля — гэта выдатны, цалком арыгінальны, беларускі паэт, які праз увагу на зьмест і форму ягонай творчасьці можа быць слушна названы „вясковым лірнікам“, які зросься ў вадно цэлае з родным сялом і беспярастанку будзіў яго ад сну векавога.

Кончыў дзед быліну,
Ліру ўзьвесіў уноў
І будзіць з мары-сну
Люд вясковы пашоў.

Зьмест твораў Зязюлі — гэта прадусім шэрае беларускае жыцьцё ў рожных ягоных праявах, якое паэт прыбірае ў прыгожыя паэтыцкія формы і якое будзіць да народнай сьведамасьці.

На пакладзе у сьвіронку
Напаткаў я ліронку
Што ўкурэўшы ляжала
І бутвець пачынала...
Грай радзімай старонцы,
Аб прыгожай вясонцы,
Што як зорачка ясна
К нам ідзе доля красна.

Зьместам Зязюлінай творчасьці служыць так-жа і беларуская прырода, якой паэт удзяляе ня мала месца і якую апявае з прастадушнай і сардэчнай любасьцяй.

Дыхануў сухавей
У пагодлівы дзень,
Скалыхнуўшы травіцай няроўнай;
У ляску салавей,
Захаваўшыся ў цень,
Захліпаецца песьняй чароўнай.

Вось пісьмо жудаснага зьместу:

„Прачытаўшы ўкраінскую газэту „Хлібороб“, з якой мы даведаліся, што карэспандэнт тае газэты хоча даведацца аб жыцьці беларусаў у далёкай паўдзённай Бразыліі, парашылі напісаць аб жыцьці беларускай эміграцыі ў сваю родную беларускую газэту.

Прыняло нас г. зв. эміграцыйнае бюро. Пратрымаўшы дзевяць дзён, распусьцілі нас ўва ўсе бакі Бразыліі. Разышліся нашы беларусы, хто куды. Пакуль былі сякія-такія грошы, дык было сяк-так. Але нашы эміграпты заўсяды прыяжджаюць бадай зусім бяз грошай. Арганізацыі сваей няма, дык і няма каму заапекавацца беларускім эмігрантам. Нашы эмігранты йдуць шукаць работы, самі ня ведаючы куды, пехатой. Вельмі часта можна спаткаць „экспрэсса“ на пехату ўздоўж жалезнай дарогі. Запытаеш — хто ты? — Я эмігрант з Польшчы — я беларус. Запытаеш, — даўно ты ў Бразыліі? Адказ — год, паўтара. А дзе рабіў? — ды нідзе. А куды йдзеш? — я і сам ня ведаю, куды я йду; вот іду, куды вочы вядуць і пакуль ногі носяць.

Работы ўсе заўсяды аддаюцца падрадчыкам. Падрадчыкі пераважна мясцовыя. Наш чалавек, не разумеючы партугальскай мовы і ня ведаючы мясцовых правоў, часта працуе толькі за хлеб. Працуе месяц, два, папросіць падрадчыка платы, а ён кажа, што тваіх грошай у яго няма і надалей няма ў яго для цябе і работы.

Дык вось якое жыцьцё нашай эміграцыі ў Бразыліі. У гэтым вялікая частка нашае бяды, што няма адпаведных эміграцкіх беларускіх арганізацыяў. Іншыя народы, якія маюць свае арганізацыі, такой бяды вялікай ня церпяць. Адным словам, усюды патрэбны свае арганізацыі. Без арганізацыі народ прападае. Калі мы былі на бацькаўшчыне, не дацэнівалі значэньня арганізацыі. Цяпер мы ведаем, нашто патрэбная свая арганізацыя. Арганізацыя ня менш патрэбная ад хлеба, бо арганізацыя—сіла, а без арганізацыі мы слабыя і ўсюды „сьляпыя“. Дзеля таго, што за нас ніхто не заступіцца, бо мы ня маем ані свайго консуля, ані арганізацыі, нас крыўдзяць і падрадчыкі і ніхто не заапякуецца намі і не паможа знайсьці працы.

Дзеля таго наш народ церпіць вялікую бяду і ў краю, што ня ўступае ў свае арганізацыі.

Яшчэ просім высылаць нам родную беларускую газэту, якую мы чыталі, будучы ў краю, але за мала цанілі яе. Цяпер мы знаем цану сваей газэты і арганізацыі, жыцьцё навучыла цаніць сваё роднае.“

Гэтым і закончым.

6. I. 31. **Р. Раманюк, В. Ягадніцкі, Гр. Стэфановіч, Г. Карповіч.**

Чытайце і пашырайце

«Беларускую Крыніцу«!

## З Польшчы.

**Чарговая сэсія Сойму,** пасьля сэсіі буджэтнай, пачалася ў сераду 25 г. м.

**Аднак-жа паслоў ня можна караць за пасольскія прамовы.** У Быдгашчы нядаўна адбыўся суд над паслом П.П.С. Качаноўскім за тое, што ў прамовах стараўся „выклікаць пагарду да дзяржаўнага строю і распараджэньняў і што паддаваў перакручаныя факты“, цьвердзячы, што „ў Польшчы горшыя адносіны, як за часоў царскіх“.

Абвінавачаны прызнаўся да ўсяго, што яму закідае акт абвінавачаньня, але не пачуваецца вінаватым, бо паводле конституцыі ўсё тое, аб чым ён гаварыў, было не барацьбой з „дзяржаўным строем“, але з памылкамі, што ёсьць абавязкам пасла.

Суд Качаноўскага апраўдаў, бо паводле конституцыі (арт. 21) ня можна караць пасла за выкананьне пасольскіх абавязкаў, да якіх залічваюцца і пасольскія справаздачы і інфармаваньні выбаршчыкаў аб адносінах у дзяржаве.

## З заграніцы.

**Амэрыка** прымусова высяляе эмігрантаў. Прэзыдэнт Зл. Шт. Амэрыкі выдаў закон у справе высяленьня чужаземцаў з Амэрыкі, якія ня маючы работы зьяўляюцца цяжарам для дзяржавы. На высяленьне безработных чужаземцаў з Амэрыкі прэзыдэнт Гувэр асыгнаваў 1 мільён даляраў.

**II міжнародная сацыялістычная арганізацыя аб „пацыфікацыі“ у Зах. Украіне.** Выканаўчае бюро II інтэрнацыяналу склікала сэсію II інтэрнацыяналу ў Цурых, на якой будзе разглядацца між іншымі і справа „пацыфікацыі“ у Галіччыне.

**Нямецкі** парлямэнтарызм, а разам і ўся Нямеччына, перажывае цяпер паважны палітычны крызыс. Народныя сацыялісты (гітлероўцы) і нацыяналістычныя паслы вышлі з парляманту (рэйхстагу). Выходзячы заявілі яны, што вернуцца ў парлямант толькі тады, калі трэба будзе акачальна перашкодзіць варожай дзейнасьці для нямецкага народу парлямэнтарнай большасьці.

**Бэльгія.** Правадыр бэльгійскіх сацыялістаў б. прэм'ер зьмясьціў у адной бэльгійскай газэце стацьцю, у якой між іншым заяўляе: — Бэльгійскія сацыялісты ўважаюць несправядлівасьцяй тое, што вэрсальскі трактат пабольшыў тэрыторыю Польшчы.

**С.С.Р.Р.** Маскоўскі Комінтэрн апрацаваў шырокі плян наладжаньня ў Амэрыцы і Эўропе дня 25 г. м. дэманстрацыі безработных. Паводле пляну Комінтэрну ў дэманстрацыю 25 лютага павінны былі ўцягненыя ня толькі адны камуністы, але ўсе безработныя. Як гэтая дэманстрацыя ўдалася камуністамі, пакульшто няведама.

## Да нас пішуць.

### БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА ШЫРЫЦЦА.

**в. Алешкі,** Вялейскага пав. 15 г. м. алешкаўская моладзь пад кіраўніцтвам Б. Бабарыкі, сябры ўраду Будслаўскага гуртка Бел. Інст. Гасп. і Культ., зладзіла беларускае прадстаўленьне ў сваей вёсцы. Адыгралі два сцэнічныя творы: „Міхалка“ і „Пярэстая красуля“. У Алешках гэта ўжо другі раз адбылося беларускае прадстаўленьне, але моладзь алешкаўская першы раз выступала на сцэне. Аднак першы блін не выйшаў комам. Ігралі вельмі добра. Народу на прадстаўленьне прыбыло столькі, што мусілі іграць упомненыя штукі два разы. Першы раз для старэйшых, а другі раз для моладзі.

Пажадана, каб алешкаўская моладзь запісалася ў Будслаўскі гуртoк Б. І. Г. і К., або заложыла такі гурток у сваей вёсцы. Выручаныя грошы трэба заўсёды пакіраваць на справы культурныя, як кніжкі і газэты.

Цікавы.

### ГАСПАДАРСКІЯ ЦЯЖАРЫ.

**Цяцеркі,** Браслаўскага пав. Гаспадарчы крызыс ужо так прыціснуў нашае сялянства, што яно толькі стогне. Было цяжкое жыцьцё ў мінулых гадох, але куды было лягчэйшым ад жыцьця цяперашняга. Мінулы год для сялянства — гэта год дармовай сялянскай працы. Калі-б пералічыць увесь прадукт сялянскай гаспадаркі ва грошы паводле цяперашняй цаны і аблічыць дні працы ў гаспадарцы дзеля здабыцьця гэтага прадукту, дык селянін за дзень сваей працы змог зарабіць ня больш 15 грошай. Неаплачываецца цяпер так-жа і гадоўля жывёлы ў гаспадарцы. Добрая карова мае вартасьць ня больш 120 зл., а яе-ж трэба гадаваць 4 гады. Але-ж у нас вельмі мала ёсьць такіх гаспадарак, якія могуць гадаваць кароў на продаж. У нас пераважна гаспадаркі такія, якія маюць адну карову і аднаго каня. Дык вось цяпер нашы сяляне і застагналі, бо заработкаў нідзе ніякіх, дробны сялянскі прадукт, як лён і інш., за нашто йдзе, а палаткі не зьмяншаюцца і не танее тавар фабрычнага вырабу. Сялянская моладзь данашывае старыя лахі і абутак, а старэйшыя ўжо „прывыкаюць“ да дзеравяк і „адвыкаюць“ ад вопраткі фабрычнага вырабу. Рожніца нават вонкавага выгляду між мясцовымі беларусамі і польскімі чыноўнікамі сталася вялізарная. Чыноўнікі і іх сем'і добра адзеты і добра абуты. За дробныя грошы здабываюць ад сялян найлепшага гатунку сялянскі прадукт, як масла, яйкі і інш. Словам, жывецца на сяле добра толькі чыноўнікам, а сяляне ад гэтае „лабраты“ аж стогнуць.

Гэты гаспадарчы крызыс ад'емна адбіваецца і на жыцьці духовым. Многія наіўныя, так як і ў выбарах, думаюць, што цяжкі лёс беларусаў направіць нейкі добры пан. З гэткай думкай некаторыя запісваюцца ў польскія арганізацыі, каб і іх не абмінула

---

Што да формы вершаў Зязюлі, дык яна, як і іхны зьмест, чаруе нас сваей дзіўнай прастатой, рознаякасьцяй і лёгкасьцяй; чаруе так-жа нас верш Зязюлі і чысьцінёй беларускай мовы, яе ёмкасьцяй і мілагучнасьцяй.

Вершы Зязюлі поўны шчырага патрыятызму, сардэчнай любові Беларусі, а так-жа поўны глыбокай веры ў лепшую будучыю беларускага народу.

Старонка мілая, Ты многімі забыта,
Шмат сьпіць сыноў Тваіх адвечным сном!
Зямелька родная, сьлязьмі і потам зьліта—
Мы да жыцьця з табой узноў уваскрасём.
Хоць знойдзецца ў Табе выродны валакіта
Катораму Твая да несмадобы сьвіта
І не адзін прадасьць цябе Іскарыёт,
Але табе яшчэ ўсёж, маці семяніта,
Сяляне верныя, што сеяць жыта,
А з іх паўстане Твой народ.

Паэзія Зязюлі навеяна так-жа жывым пачуцьцём рэлігійным. Праўда, матывы для сваіх песьняў паэт бярэ з акружаючага яго сялянскага быту і роднай прыроды, але апошняй прычынай, якая яго панукае іграць на беларускай ліры, — ёсьць Бог, Тварэц сьвету, як першая і апошняя падстава Красы і Справядлівасьці. Для Зязюлі ўсё беларускае адраджэньне — гэта Божая справа.

Дык паслухайжа, браток,
Гэтакай вось рады:
Палюбі ты свой куток,
Мову, строй, абрады.
А Стварыцель наш ласкавы,
Што вачэй ня зводзіць
З нас, убачыць твае справы,
Ў стокрот нагародзіць.

Канчаючы гэтыя кароткія ўвагі аб Зязюлі, трэба яшчэ дадаць, што гэта паэт вялікай духовай культуры. Мэтай яго песьняў —збуджаны, адроджаны, шчасьлівы беларускі народ, а вядзе да гэтай вялікай мэты, паводле Зязюлі, толькі аружжа духа: шчырая любоў, гарачая вера, непаддзельная цнота. Гэткім сапраўды быў ён сам, гэткага духа пакінуў нам і творы свае.

Асьвяці наш розум верай,
Льгі надзею ў душы ўлі
І агонь любові шчырай
Ў сэрцах зімных запалі!

Пасьля такой малітвы, пасьля такога душы сваей настрою, вось так пяе пясьняр наш:

Бушуе хай бура, віхор хай злуецца
Хай вецер панура завые на рэчца —
Я роднага краю, што рвецца да волі,
Ня здраджу ніколі.

Хай срэбра, дукаты мне сыпяць пад ног
І скажаць: багаты будзь, кінь род убогі—
Я плюну з пагардай, народу-ж і волі —
Ня здраджу ніколі.

Да самага скону, усякім прымусам
І сіле прыгону скажу: беларусам
На век астануся, сваей уласнай волі
Ня здраджу ніколі!

Гэтак прысягнуў пясьняр наш народу свайму. Прысягнуў і прысягі сьвята датрымаў. Служыў ён народу верна ня толькі звонкай песьняй сваей, але служыў яму такжа і звычайнай шэрай грамадзкай працай: жывым словам, беларускай газэтай і кніжкай, нясучы ясны прамень сьвятла ў цёмную глуш беларускую, сапраўды не зважаючы ні на буры ні на віхры, якія злосна гудзелі над галавой ягонай. Зязюля — гэта праўдзівы ідэаліст, гэта мучанік за родную ідэю. Гнаны польскай духоўнай уладай за сваю беларускасьць з парафіі ў парафію, а часта і цалком пазбаўлены за гэта пасады, туляўся бяздомны па шырокай Беларусі ад таварышаў да таварышаў, ад знаёмых да знаёмых, ад прыяцеляў да прыяцеляў, носячы ў вялікай душы сваей крыўду і ніколі не гаснучы жар любові да падняволенага народу.

**Я. Сакалінскі.**

„ласка“ пана. Браты, ня туды наша дарога да лепшага. Наш шлях — ар'ентацыя на свае ўласныя сілы!

Г. Пяцюкевіч.

## МЯЙСЦОВЫЯ ПАРАДКІ.

**Сьвіслач**, Ваўкавыскага пав. Каб усё апісаць, што ў нас дзеіцца і якія парадкі, трэба шмат мейсца ў газэце і часу. Апрача гэтага, у газэце трудна ўсё і надрукаваць, бо ведама — газэту сьпярша чытаюць у прэсавым (газэтным) аддзеле адміністрацыйныя ўлады і калі яе там не сканфіскуюць, дык толькі тады яна зможа прыйсьці ў вёску і прынесьці весткі. Вось дзеля гэтага я напішу толькі аб тым, за што газэты не сканфіскуюць.

Кепска робяць падросткі, што сільлямі (пятлёй) ловяць птушак. Але за гэткі праступак і „праступнікаў“ 11—12 гадовых хлапцоў павінны караць толькі іхнія бацькі, або апякуны, якія зьяўляюцца адказнымі за недагляд дзяцей прад уладамі. На мой пагляд, не павінна за такія праступкі цягнуць дзяцей да адказнасьці паліцыя. Тымчасам у нас здарыўся выпадак, што за такі праступак паліцыя забірала на пастарунак 11—12 гадовых дзяцей. Вывік аказаўся несамавіты.

Каля нас распаложана слаўная Белавеская пушча, але на дровы сялянам дык голад. Лясьніцтва прадае дровы два разы ў тыдзень. Да лясьніцтва зьяжджаецца заўсёды цэлы кірмаш фурманак. Пан лясьнічы ў гадзіны „ужэндовыя“ ад 11 гадзіны раніцы прадасьць 20-30 мэтраў і баста. Хто дабіўся купіць, добра, а хто не дабіўся — едзь за 20-30 вёрст дамоў і прыяжджай другі раз. Просьбаў сялян пан лясьнічы і слухаць ня хоча, ён робіць усё па „казённаму“.

У гміне нашай таксама ня ўсё ў парадку. Пасьля рэвізіі гміннай касы памоцнік пісара „паехаў адпыхаць“!

Ёсьць у нас і „мастак“, што малюе дошчачкі да вазоў і за кожную дошчачку бярэ 1 зл. Гэты майстра мае на гэта дазвол ад старазства. Калі хто ня хоча, каб гэты майстра маляваў яму дошчачку, дык майстра піша на таго пратакол і пасылае ў староства, а там ведама, што робяць з гэтых пратаколаў.

Дык вось якія ў нас парадкі. ОК.

## КРЫХУ АБ ВЫБАРАХ.

**Сноў**, Нясьвіскага пав. Апрача ўжо ведамых выбарных штучак у нас было і яшчэ іншае. У нас галасавалі адкрыта за „адзінку“ толькі тыя, каторыя вінаваты ў банк грошы. Пасьля выбараў мы атрымалі ўсе выбарныя газэты. У часе выбараў беларускія газэты да нас не даходзілі. Дык і ня дзіва, што мы ня выбралі сваіх беларускіх паслоў. В. Х.

## ЗА КАМАСАЦЫЮ АПІСАЛІ КУРЭЙ І ПАРАСЯТ.

**М. Волхва**, Баранавіцкага пав. У нас праводзяць камасацыю. Вялікая частка наших людзей на камасацыю па ахвоце не хацела йсьці. Але ўлады праводзяць камасацыю паводле „уставы“. Вёска мусіць даць каморніку памешканьне і апрача гэтага на дробныя расходы па 1 зл. ад дзесяціны. Тыя, што хацелі камасацыі, заплацілі дабравольна, а каторыя ўпіраліся—дабравольна складчыны не плацілі. Цяпер за гэту складчыну войт апісаў неахвотнікам камасацыі—ў каго куры, а ў каго парасяты. Як прыйшлося да „сьцягіваньня“ гэтых залатовак, дык у вёсцы падняўся цэлы гармідар. У аднэй хаце не аддаюць войту курэй, а ў іншай ня хочуць аддаць парасят. Войт пахадзіў па вёсцы, паліцэйскі пaглядзеў, як бароняць сяляне сваю жывёлу і паехалі сабе ў гміну. Што з гэтым будзе далей — няведама.

Яш.

## ХТО ЧУРАЕЦЦА СВАЙГО РОДНАГА, ТАГО ЧУРАЮЦЦА ЛЮДЗІ.

**Шчучынскі пав.** Хачу напісаць у сваю родную газэту хоць пару слоў аб сваей роднай старонцы, а прадусім аб Ішчолянскай моладзі, якая адноўчы задумала наладзіць польскае прадстаўленьне — „забавэн танэчнон“. Ну і выйшла тады „прадстаўленьне!“

Напісалі запросіны паном, падпаном і шляхтуном. Прынесьлі дзюравы самавар, заткнулі дзірку шыкулём накруціўшы анучай і думалі прыймаць запрошаных гасьцей. Калі хто зьвяртаўся з сялян з запытаньнем, ці можна прыйсьці паглядзець, адказвалі, што да іх прыедзе стараста. А калі хто напамінаў, чаму ня прыслалі запросінаў, адказвалі — „для панув запрошэне, а для хамув оглошэне“. На запытаньні цікавых, хто будзе на гэтым іхнім прадстаўленьні, адказвалі: — „паліцыя з карабінамі“.

Прышоў час уплываванай „танэчнай забавы“. У дзьвярах паставілі вартаўніка з бізуном у руках і рэменем пад барадой. Але на гэткую „забаву“ ня прыехаў чаканы стараста і ніхто з паноў і падпанкоў; ня ўступіў туды так-жа ані адной нагой ніхто і з сялян. На сваей „забаве“ самі адны арганізатары „ачысьцілі“ прыгатаваны буфэт і тады пусьціліся ў гульні, хто на кулакі, а больш вясёлыя дык і зашчаміўшы ў руках нажы.

Браты, шкода Вас, што Вы такія цёмныя. Выпісвайце сваю родную газэту і ўважна яе чытайце. Яна Вас навучыць, як шанаваць самых сябе і людзей.

Знайце і ў чужыя сані не сядайце!

Ул.

# З Краю.

### Школьны крызіс.

Цяпер крызіс стаўся ў модзе. Праяўляецца ён у ваўсіх галінах жыцьця: сьціснуў гандаль і промысел, сашчаміў кастлявай рукой сялянства, абнізіўшы да найніжэйшае цаны рольную прадукцыю; стаўся прычынай безрабоцьця, адрываючы людзей ад варштатаў працы, а ў зьвязку з безрабоцьцем прымусіў недаядаць або і сусім галадаваць. А гэтаму прычынай, як цьвердзяць палітыкі і эканамісты, ёсьць сусьветны гаспадарчы крызіс. Але мы хочам пазнаёміць нашых чытачоў яшчэ з адным крызісам — школьным.

Галоўны Урад Саюзу Польскага Вучыцельства ў сваім камунікаце з дня 16 г. м. сьцьвярджае, што ёсьць крызіс і ў школьніцтве. Гэты камунікат цьвердзіць, што з браку школьных будынкаў вагромны лік дзяцей астаецца бяз школы.

У Маладэчанскім пав. не хапае мейсца ў школах: у Палачанскай гміне для 210 дзяцей, у Беніцкай гм. для 160 дзяцей, у Красенскай гм. для 83 дзяцей.

У Віленска-Троцкім пав. не хапае мейсца ў школе: у Падбжэскай гм. для 140 дзяцей, у Міцкунскай гм. для 95 дзяцей, у Немэнчынскай і Рудзіскай гм. для 132 дзяцей.

У Дзісьненскім пав. не хапае мейсца ў школе: у Докшыцкай і Лужыцкай гм. для 110 дзяцей.

У ва ўсіх паветах амаль тое самое — у кожнай гміне брак школьных будынкаў і дзесяткі, або сотні дзяцей, ужо знаходзяцца паза школай.

У наступным школьным годзе, цьвердзіць камунікат польскага вучыцельства, з гэтым будзе яшчэ горш, бо ня хопіць мейсца ў школе яшчэ для 20.000 дзяцей.

# Усячына.

**Шаляпін выйграў суд проціў савецкага ураду.** Ведамы сьпявак Шаляпін падаў у францускі суд савецкі ўрад за тое, што без яго згоды камуністычныя ўлады надрукавалі яго ўспаміны. Суд прысудзіў, каб прадстаўнік савецкага ўраду ў Францыі заплаціў Шаляпіну 10 тысяч фр. адшкадаваньня і загадаў сканфіскаваць кніжку ў перакладзе на францускую мову.

**Бандыцкі напад на цягнік.** Недалёка Быдгошчы 60 азброеных бандытаў напалі на таварны цягнік, які цягнуў 100 вагонаў з вуглём і іншымі таварамі. Бандыты, затрымаўшы цягнік, павязалі ўсіх кандуктараў, забралі 150 тон вугля і некалькі пакаў іншага тавару і ўцяклі.

**Сьмерць 3 тысяч кітайскіх работнікаў.** У часе выбуху пажару ў капальні Фушун у Манджурыі згінула больш 3 тысяч кітайскіх работнікаў. Усе яны згінуні ў полымі агню, які выбухнуў у капальні.

**Аўтабусы: Варшава—Бэрлін Парыж.** Францускія газэты падаюць, што між Варшавай, Бэрлінам і Парыжам будуць курсаваць аўтабусы, у якіх устроены сядзеньні так, каб можна было замяніць у ночы на спальныя. Першыя аўтабусы пачнуць курсаваць ад 27 красавіка с. г. Цана праезду мае быць ніжэйшай, як цягнікам.

# Грамадзяне!

Газэту „Бел. Крыніцу“ пасылаем толькі падпішчыкам і супрацоўнікам.

Хто хоча атрымліваць „Бел. Крыніцу“, няхай прысылае грошы за газэту або прысылае весткі з сваей старонкі.

Усім новым падпішчыкам, хто прышле падпіску ад 1. III. да 1 V. с. г., апрача газэты вышлем прэмію.

За падпіску на цэлы год—4 зл., прэмія: 1) кніжка Беларускі гаспадарскі календар „Рольнік“ на 1931 г., 2) „Дудка Бедаруская“ і 3) беларускі адрыўны календар на 1931 год.

За падпіску на паўгоду—2 зл., — 1) Беларускі гаспадарскі календар „Рольнік“ на 1931 г. і 2) „Дудка Беларуская“.

За падпіску на 3 месяцы — 1 зл.: Беларускі адрыўны календар на 1931 г.

УВАГА: усім падпішчыкам „Б. Крыніцы“, якія ўжо прыслалі грошы і атрымалі папярэднюю прэмію, а такжа і ўсім, што прэміі не атрымалі, таксама і супрацоўнікам ўсю пералічаную вышэй прэмію вышлем па атрыманьні 1 зл. 50 гр.

Адміністрацыя „Бел. Крыніцы“, Вільня Людвісарская 1—19.

„БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА“ у месяцы сакавіку выйдзе: — 6, 13, 20 і 27.

# Instrukcyi

## Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury.

### 6. Pašyreńnie biełaruskaka drukawanaha słowa.

Hurtok pawinien dbać, kab drukawanaje biełaruskaje słowa pašyrałasia i dachodziła ŭ kožnuju hłuchuju wiosku.

Treba, kab hurtok staraŭsia wypisywać dla sialan biełaruskija knižki, hazety, kalendary i inš.

Probnyja numary hazet wysyłajucca darma. Wypiswać možna hazety ŭsialakaha palityčnaha kirunku, ale najbolš pažadana, kab sialanie čytali swaje sialanskija hazety. Dla prykładu padajom formu zajawy ab wysyłańni hazety.

U Administracyju haz. „Biel. Krynica“, Wilnia, Ludwisarskaja 1—19.

Prosim wysyłać probnyja numary Wašaj hazety na taki adras:

pošta.....................
wioska.....................
pawiet.....................
Hramadzianinu.....................
Dnia..................193__h.
(podpis).

Jak tolki Bieł. Inst. Hasp. i Kult. pačnie wydawać swoj literaturny, ci haspadarčy žurnał, usie ŭrady hurtkoŭ pawinny wypisywać jaho dla siabie i pašyrać siarod sialan.

Hramadzianie, pomnicie, što kali niama inšaj mahčymaści pracy, to **pašyreńnie biełaruskaha drukawanaha słowa zaŭsiody mahčyma** i heta pawinna być Wašym pieršym abawiazkam.

### 7. Jak damahacca ŭradawaj bieł. škoły?

Abawiazkam uradu hurtka jość pašyrać dumku ab patrebie aświety ŭ rodnaj matčynaj mowie. Treba ŭświedamlać sialan, što tolki aświeta ŭ rodnaj mowie źjaŭlajecca najbolš karysnaj dla nawuki dziaciej. Kali ŭ wioscy pierakanajucca, što treba, kab ich dzieci wučylisia ŭ biełaruskaj škole, to tady hurtok pawinien pamahać sialanam dabiwacca ŭradawaj biełaruskaj škoły. Zahadzia hurtok wypisywaje z Centrali školnyja deklaracyi, u prysutnaści kožnaha baćki dziciaci ŭ školnym wieku zapaŭniaje deklaracyju i addaje jaje baćku z tym, kab jon pajšoŭ u hminu, padpisaŭ tam deklaracyju i paprasiŭ zaświedčyć jaje.

Zhodna z Ustawaj školnaj ad 31. VII. 1924 h. i wykanaŭčym rasparadžeńniem da ŭstawy ad 7. I. 1925 i z rasparadžeńniem ad 12. II. 1925 h. deklaracyi wojt pawinien paświadčać biaspłatna. Paświedčanyja deklaracyi baćki addajuć Uradu Hurtka, jaki, kali ŭsie deklaracyi źbiare, pierasyłaje ich školnamu Inspektaru. Pry hetym treba zrabić śpisak deklaracyjaŭ, upiswajučy imia, proźwišča baćki i imia dziaciej u školnym wieku ad 7 da 14 hadoŭ. Hety śpisak hurtok pawinien pierasłać u Centralu Instytutu.

Hetakija prawy byli dahetul.

Adnak ciapier i ŭ hetych, mocna ahraničanych i kurtatych prawach, nastupiła pieramiena na horšaje. Rasparadžeńniem prezydenta Polskaj Respubliki z dn. 29 XI. 30 h. dana mahčymaść biełaruskamu narodu damahacca swajej škoły tolki za 7 hadoŭ... Ale i heta nie pawinna źniechwočwać biełaruskich kulturnych dziejačoŭ da pracy. Treba iści da taho, kab polski ŭrad nia tolki za 7 hadoŭ, ale *zaŭsiody* wiedaŭ ab tym, što biełarusy chočuć uradaj biełaruskaj škoły. Z hetaj metaj treba na źjezdach, schodach i sabrańniach wynosić rezalucyi z damahańniem rodnaj škoły, treba pry roznych śpisach i hałasawańniach śmieła padawać swoj podpis abo hołas za ŭradawuju biełaruskuju škołu, treba źbirać podpisy z damahańniem biełaruskaj škoły i pasyłać ich z adpawiednaj prośbaj da kuratara, ministra abo ŭ Sojm. Takim paradkam my budziem *zaŭsiody* damahacca taho, što dla kožnaha narodu najdaražejšaje: *swaje rodnaja škoły*.

**UWAHA.** Padrabiaznyja instrukcyi, a tak-ža, kali treba budzie, deklaracyi, błanki dla śpisu dziaciej, formy prośbaŭ da roznych uładaŭ wypiswajcie z Centrali Instytutu, Wilnia, Ludwisarskaja 1—19.